исключены отклонения правового сознания индивидов от правосознания всего общества. Эмоциональное состояние влияет на отношение к праву. Оно может быть позитивным и выражаться в соблюдение существующих норм права.

Негативная форма правосознания может проявляться в случае противоречий с общественным сознанием. В таком случае встречаются правонарушения. В этой ситуации важно изучить целевую направленность действий личности, ее мотивы, установки, интересы. В общем изучить основы выбора поведения.

Имеет место и комбинированная форма правосознания. Положительный взгляд проявляется на отдельные формы совершенствования законодательства, решающие наболевшие проблемы. При этом одновременно могут вызывать негативное отношение к законодательству, связанного с вопросами кредитно-финансовой системы, по усилению налогового обременения.

На индивидуальное правосознание влияет также персональное окружение личности и особенности ее жизни исходя из занимаемого статусного положения. Под влиянием других индивидов и формируется правовой взгляд личности. Личность находится во взаимоотношениях с другими, соприкасаясь с ними в трудовой, общественной, обыденной жизни. Индивид видит их правовое поведение, отношение к различным правовым явлениям. Со временем все это впитывается и формируется в его правосознание.

С точки зрения глубины отражения правовых явлений в структуре правосознания выделяют два уровня: обыденное и теоретическое. Обыденное порождается повседневными условиями бытия, а теоретическое стремится проникнуть в сущность явлений, познания их закономерностей…[2, с. 72].

Правосознание в социологическом плане раскрывается в следующих аспектах:

– во-первых, правосознание отражает общественные отношения, социальные явления в которых сконцентрированы взаимоотношения между различными общественными группами, людьми, конфликты, противоречия, конкуренция и т. д. Различные отношения регулируются правовыми нормами.

– во-вторых, содержательная часть правосознания включает мировоззрения, мысли, установки, ценности, отражающие реальность в сознании человека. И это все является неким стартовым механизмом к готовности активизироваться в определенной ситуации.

– в-третьих, состояние правосознания выступает результатом социально-правовых процессов. Индивид оценивает общественные отношения с целью понимания, принятия, анализа и необходимости правового регулировании.

Изучение состояния и тенденций развития правового сознания позволяет понять развитие правоотношений и регулирование поведения людей в рамках существующего права.

Список использованных источников


1. Айменов, А. Ж., Шахматова, Н. В. (2019), Правосознание как социологическая конструкция // Изв. Сарат. ун-та. Нов. сер. Сер. Социология. Политология. Т. 19, вып. 4. С. 385–388. DOI: https://doi.org/10.18500/1818-9601-2019-19-4-385-388.
2. Ратинов, А. Р. Избранные труды / [сост. М. В. Кроз, Н. А. Ратинова; предисловие О. Д. Дитковской]; Акад. Ген. прокуратуры Рос. Федерации. – М., 2016 – 212 с. – (Научные труды ученых Академии Генеральной прокуратуры Российской Федерации).


УДК 811.161.3’373.46:630

# ПОЛІСЕМІЯ Ў ТЭРМІНАЛОГІІ ЛЕСАВОДСТВА


***Русак В. У., к.ф.н., дац.***

*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*



Рэферат. *У працы разглядаецца з’ява полісеміі ў лесаводчай тэрміналогіі беларускай мовы. Адзначана, што ў аналізуемай галіне прысутнічаюць мнагазначныя тэрміны, якія выходзяць за межы спецыяльных абласцей ведаў, міжсістэмныя, а таксама ўнутрысістэмныя полісеманты.*



Ключавыя словы: тэрміналогія лесаводства, полісемантычныя тэрміны, міжсістэмная

полісемія, унутрысістэмная полісемія, спецыялізацыя значэння агульнаўжывальнага слова, метафарычны перанос, метанімічны перанос.

Праблема тэрміналагічнай полісеміі ў сучаснай лінгвістыцы не мае адназначнага рашэння і звязана з наяўнасцю двух супрацьлеглых поглядаў на прыроду тэрміна. Адны вучоныя лічаць, што тэрміналагічная лексіка не існуе ізалявана ад агульналітаратурнай мовы, а з'яўляецца яе часткай, таму цалкам натуральна тое, што ў ёй фіксуецца такая лексіка-семантычная з'ява, як полісемія, калі ў аднаго і таго ж слова без змены знешняй формы развіваюцца два і больш семантычных варыянта-значэння. Прыхільнікі іншага пункта гледжання прыпісваюць тэрміну прымету адназначнасці. Так, на думку Даніленкі В. П., тэрмін уяўляе сабой «адзін знак, якому адпавядае адно паняцце» [1, с. 36]. Вельмі катэгарычна на гэты конт выказалася Талікіна А. М.: «У тэрміналагічнай сістэме ў адпаведнасці з агульнай семантычнай заканамернасцю прынцыпіяльна выключаюцца адносіны аманіміі і полісеміі (адзін знак – адно абазначэнне)» [2, с. 58]. Галавін Б. М. і Кобрын Р. Ю., характарызуючы полісемію як негатыўную з'яву ў тэрміналогіі, адзначалі, што мнагазначнасць з'яўляецца «адным з фактараў, якія ўскладняюць камунікацыю» [3, с. 48].

Аднак моўная практыка даказвае, што ў прафесійным маўленні поўнасцю пазбавіцца ад полісеміі не ўдаецца. Яе наяўнасць вучонымі тлумачыцца «расслаеннем значэнняў у залежнасці ад ужывання слова ў розных галінах ведаў» [4, с. 124], уласцівасцю тэрміна функцыянаваць у мове з розным аб'ёмам семантыкі [5], прыватнай дзейнасцю чалавека, у працэсе якой «адбываецца ўзаемная «падгонка» элементаў мовы ў абазначаных імі элементах сітуацыі» [6, с. 262], рэалізацыяй закона моўнай эканоміі. Даследчык Татарынаў В. А. адзначаў: «Пры намінацыі тэрмінам іншага дэнатата (аб'екта, паняцця) узнікае новае значэнне ў таго ж тэрміна, развіваецца полісемія. Змена межаў семантыкі тэрміна, узнікненне новых значэнняў – заканамерная з'ява тэрміналогіі, якая развіваецца <…>. Калі за тэрмінам усталяваць раз і назаўсёды дадзены аб'ём, то будзе закансервавана і выражаемае гэтым тэрмінам паняцце. Семантычная вызначанасць тэрміна разумеецца не ў сэнсе яе закасцянеласці, а ў сэнсе пастаяннага ўдакладнення аб'ёму паняцця, абазначанага тэрмінам» [7, с. 8].

У беларускамоўнай тэрміналогіі лесаводства выдзяляюцца мнагазначныя адзінкі, якія выходзяць за межы спецыяльных галін ведаў, міжсістэмныя (міжгаліновыя), а таксама унутрысістэмныя (унутрыгаліновыя) полісеманты.

Наяўнасць полісемантаў, якія выходзяць за межы спецыяльных галін, абумоўлена тым, што многія лесаводчыя тэрміны былі ўтвораны шляхам спецыялізацыі значэнняў агульнаўжывальных слоў: лес, дрэва, кара, ствол, пень, крона, глеба, мох, грыб, хмызняк, балота, гняздо, верасняк, дубняк, грабняк, гай, бор, галіна, лапка, гронка, атожылак, куст.

Тэрміналогія лесаводства таксама ілюструе актыўнасць метафарызацыі як спосабу тэрмінаўтварэння. У якасці прыкладу полісемантаў, спецыяльнае значэнне якіх было сфарміравана на аснове метафарычнага пераносу значэнняў агульнаўжывальных слоў, можна прывесці наступныя: вочкі 'сляды пупышак, якія не развіліся ў парастак' (параўнаем з агульнаўжывальным вочкі/вочы 'орган зроку'); лялечка 'жыццёвая стадыя некаторых насякомых' (параўнаем з агульнаўжывальным лялечка/лялька 'дзіцячая цацка ў выглядзе чалавека'); мазаіка 'нераўнамернасць афарбоўкі лісця' (параўнаем з агульнаўжывальным мазаіка 'твор мастацтва альбо малюнак, зроблены шляхам зборкі невялікіх кавалкаў шкла); крупы 'цвёрдыя ападкі ў выглядзе дробных часцінак з празрыстай ледзяной абалонкай або непразрыстых круглаватых снежных матава-белых часцінак дыяметрам каля 2-5 мм' (параўнаем з агульнаўжывальным крупы 'харчовы прадукт, які складаецца з суцэльных ці драбнёных зерняў розных культур'); ложа 'падушкападобнае спляценне міцэлію грыба' (параўнаем з устарэлым ложа 'пасцель'); пасынак 'гэта другая вяршыня дрэва, якая адмерла ці адстала ў росце' (параўнаем з агульнаўжывальным пасынак 'няродны сын'); апёк 'пашкоджанне раслін, выкліканае дзеяннем сонечных прамянёў, канстраснымі тэмпературамі, некаторымі грыбамі, бактэрыямі, пестыцыдамі (параўнаем з агульнаўжывальным апёк 'пашкоджанне цела агнём, сонцам, радыяцыяй ці чым-небудзь іншым гарачым, пякучым'); покрыва (расліннае) 'сукупнасць раслінных згуртаванняў пэўнага ўчастка' (параўнаем з агульнаўжывальным покрыва 'верхні слой, які пакрывае што-небудзь'); подсціл 'злежаны на паверхні глебы слой адмерлых і апалых частак раслін – лісця, пладоў, кветак, кары і невялікіх галін' (параўнаем з агульнаўжывальным подсціл 'тое, што падаслана, падкладзена пад што-небудзь').

Да міжсістэмных тэрмінаў-полісемантаў адносяцца тыя, якія выкарыстоўваюцца ў розных

спецыяльных галінах ведаў, але аб'яднаны наяўнасцю прамой або апасродкаванай сувязі паміж значэннямі [8, с. 82]. Напрыклад, тэрмін фармацыя ў лесаводстве ўжываецца са значэннем 'групы раслін, якія характарызуюцца адным ці некалькімі агульнабіялагічнымі відамі', а ў геалогіі мае значэнне 'сукупнасць генетычна звязаных горных парод аднаго часу і спосабу ўтварэння' (у значэннях дадзенага полісеманта прасочваецца абазначэнне падабенства па паходжанні). Тэрмін эміграцыя ў лесаводстве зафіксаваны са значэннем 'масавае высяленне жывёл са звыклых месцаў пражывання', а ў грамадазнаўчых навуках ужываецца са значэннем 'перасяленне людзей з радзімы ў іншую краіну па эканамічных, палітычных, рэлігійных і іншых прычынах' (у значэннях полісеманта прысутнічае абазначэнне перасялення са звыклага месца). Тэрмін марфалогія (лесу) у лесаводстве мае значэнне 'навука пра будову лесу, асноўныя кампаненты лясной экасістэмы', а ў мовазнаўстве тэрмін марфалогія абазначае 'навуку пра часціны мовы, іх граматычныя катэгорыі, формазмяненне і словаўтварэнне' (у значэннях полісеманта прысутнічае абазначэнне асаблівасцей будову, формы).

Існаванне ўнутрысістэмнай полісеміі ў тэрміналогіі лесаводства звязана з развіццём навукі пра лес. З'яўленне новых ведаў нярэдка цягне за сабой пашырэнне семантычнай структуры існуючых тэрмінаў. Адным з асноўных фактараў з'яўлення мнагазначнасці ў лесаводчай тэрміналогіі з'яўляецца метанімічны перанос, калі новыя значэнні фарміруюцца на аснове сумежнасці:

– працэсу (дзеяння) і месца дзеяння: высечка: 1) 'працэс спілоўвання або зразання дрэў і вывазу іх з лесу'; 2) 'лясная пляцоўка, на якой дрэвастой высечаны, а маладыя дрэвы яшчэ не ўтварылі полаг';
– працэсу (дзеяння) і колькаснага выніку дзеяння ('колькасць прадукту'): прырост (біямасы, драўніны, дрэў): 1) 'павелічэнне ў колькасных адносінах (біямасы, драўніны, камбіяльнага слою)'; 2) 'велічыня, на якую змяняецца запас біямасы, драўніны, камбіяльнага слою'; забруджванне: 1) 'прыўнясенне ў асяроддзе новых, звычайна нехарактэрных для яго фізічных, хімічных, інфармацыйных, біялагічных агентаў'; 2) 'павелічэнне канцэнтрацыі фізічных, хімічных, інфармацыйных, біялагічных агентаў вышэй за нядаўна назіраемую колькасць';
– працэсу (дзеяння) і якаснага выніку дзеяння ('стан'): паляганне: 1) 'прыгібанне травяністых раслін да зямлі'; 2) 'хвароба раслін, якая праяўляецца пажаўценнем і прыгібаннем іх да зямлі'; інтрадукцыя: 1) 'спецыяльны або выпадковы перанос асобін якога-небудзь віду за межы арэала'; 2) 'паспяховае ўкараненне асобін далёкага віду ў мясцовыя прыродныя комплексы';
– дзейнасці і навуковай дысцыпліны: лесаводства: 1) 'галіна гаспадарчай дзейнасці па вырошчванні, доглядзе, рацыянальным выкарыстанні і ахове лясоў; 2) 'навука, якая распрацоўвае тэхніку і тэхналогію вырошчвання лесу ў розных прыродных і вытворча-эканамічных умовах, тэорыю і практыку высечак лесу ў мэтах яго выкарыстання і ўзнаўлення, вырошчвання высокапрадукцыйных насаджэнняў';
– аб'екта даследавання і навуковай дысцыпліны: лясныя культуры: 1) 'насаджэнні, створаныя пасевам або пасадкай драўнінных і хмызняковых парод'; 2) 'навуковая дысцыпліна, якая вывучае і распрацоўвае тэорыю і практыку штучнага аднаўлення лесу';
– расліны і плада гэтай расліны: журавіны, суніцы, чарніцы, брусніцы, маліны;
– дрэва і драўніны гэтага дрэва: ліпа, дуб, бяроза, граб;
– сукупнасці аб'ектаў і адзінкавага аб'екта: арганізм: 1) 'від жывога'; 2) 'асобны элемент аднастайнага жывога рэчыва як сукупнасці, якая ўдзельнічае ў геахімічных працэсах' і інш.

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў тэрміналогіі лесаводства функцыянуюць мнагазначныя тэрміны, якія выходзяць за межы спецыяльных галін ведаў, міжсістэмныя, а таксама унутрысістэмныя полісеманты. У даследуемай тэрмінасістэме найбольш развіта катэгарыяльная мнагазначнасць, заснаваная на метанімічных (строга лагічных) адносінах.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Даниленко, В. П. Русская терминология: опыт лингвистического описания / В. П. Даниленко. – М. : Наука, 1977. – 246 с.
2. Толикина, Е. Н. Некоторые лингвистические проблемы изучения термина / Е. Н. Толикина // Лингвистические проблемы научнотехнической терминологии. М. : Наука, 1970. – С. 53–67.
3. Головин, Б. Н. Лингвистические основы учения о терминах: учебн. пособие для

филологических спец. вузов / Б. Н. Головин, Р. Ю. Кобрин. – М., 1987. – 104 с.
4. К вопросу о специфике термина / Н. З. Котелова // Лингвистические проблемы научно-технической терминологии. М. : Наука, 1970. – С. 122–126.
5. Марчук, Ю. Н. Основы терминографии: методическое пособие / Ю. Н. Марчук М. : ЦИИ МГУ, 1992. – 76 с.
6. Гак, В. Г. Лексическое значение слова / В. Г. Гак // Лингвистический энциклопедический словарь. М. : Большая Российская энциклопедия, 1998. – С. 261–263.
7. Татаринов, В. А. Лексико-семантическое варьирование терминологических единиц и проблемы терминографии: автореф. дисс. ... к. филол. н.: 10.02.19 / В. А. Татаринов; МГУ. – М., 1988. – 24 с.
8. Чистюхина, С. Н. Межотраслевая полисемия в терминологической системе современного английского языка / С. Н. Чистюхина // Вестник Университета российской академии образования. Серия: Филология и журналистика. – 2011. – №1. – С. 80–83.

УДК 378:004

# КОМПЬЮТЕРИЗАЦИЯ И ИНФОРМАТИЗАЦИЯ ОБУЧЕНИЯ: СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ И ПЕРСПЕКТИВЫ, ПРОБЛЕМАТИКА ВНЕДРЕНИЯ

***Самодин Д. С., асп.***

*БГТУ «ВОЕНМЕХ» имени Д. Ф. Устинова,*
*г. Санкт-Петербург, Российская Федерация*

Реферат. *В статье рассматриваются особенности процессов компьютеризации и информатизации обучения. Анализируется роль информационных технологий в процессе преподавания дисциплин различного профиля.*

Ключевые слова: компьютеризация, информатизация, обучение, технологии, учебный процесс.

В настоящее время информационные технологии играют все более важную роль в различных сферах нашей жизни, включая образование. Компьютеризация и информатизация обучения стали неразрывно связанными понятиями, оказывающими значительное влияние на современные тенденции развития системы образования. В данной научной статье будут рассмотрены основные аспекты компьютеризации и информатизации обучения, их преимущества и перспективы, а также приведены таблицы, демонстрирующие актуальную статистику и данные в этой области.

1. Роль информационных технологий в образовании. С развитием информационных технологий компьютеризация обучения стала неотъемлемой частью современной системы образования. Компьютеры и интернет стали не только доступными средствами общения и развлечения, но и эффективными инструментами для обучения. Цифровые технологии позволяют разнообразить учебный процесс, сделать его более интерактивным и привлекательным для студентов разных возрастных групп. Также они способствуют повышению качества образования и эффективности учебного процесса.

2. Преимущества компьютеризации и информатизации обучения. В современном мире компьютеры и информационные технологии играют все более важную роль в различных сферах жизни, включая образование. Компьютеризация и информатизация обучения имеют множество преимуществ, которые значительно улучшают процесс обучения и обеспечивают более эффективное усвоение знаний.

Первое и, пожалуй, наиболее очевидное преимущество компьютеризации и информатизации обучения – это доступ к огромному объему информации. С помощью компьютеров и интернета студенты могут получить доступ к различным источникам информации, включая электронные библиотеки, базы данных, научные статьи и многое другое. Это позволяет им расширить свои знания и глубже изучить интересующие темы.

Второе преимущество компьютеризации и информатизации обучения – это возможность индивидуализации образовательного процесса. Компьютерные программы и приложения